# Радзівілы «спыніліся» ў Віцебску

**У Віцебскай абласной бібліятэцы напярэдадні жаночага свята адкрылася выстава акварэльных партрэтаў вядомых беларускіх жанчын мінулых стагоддзяў. Сярод гістарычных персаналій (як сёння б сказалі, «свецкіх львіц») — Людвіка Караліна Радзівіл, Барбара Радзівіл, Францішка Уршуля Радзівіл і не толькі яны, а, напрыклад, і біблейскія гераіні — Ева, Юдзіф...**

Аўтар гэтых твораў — вядомы віцебскі акварэліст Міхась Ляўковіч. Ён доўгі час узначальваў суполку «Віцебская акварэль». Працуе старшым выкладчыкам жывапісу, малюнка і кампазіцыі на кафедры выяўленчага мастацтва славутага мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. Машэрава. Цікава, што вядомы мастак не здолеў з першай спробы паступіць на мастацка-графічны факультэт, дзе доўгі час выкладае. Пайшоў у армію і толькі потым паспяхова "ўзяў" ВНУ (на той час — педагагічны інстытут імя Кірава). Творчы шлях майстар пачынаў як акварэліст. Удзельнічаў у розных прэстыжных конкурсах. У 1991 годзе Міхась Ляўковіч атрымаў першую прэмію па акварэлі ў конкурсе сярод мастакоў, пераможцаў якога выбіралі мастацтвазнаўцы з Траццякоўскай галерэі.

Між іншым, свае работы ён традыцыйна падпісвае па-беларуску. Міхаіл Васільевіч Ляўковіч, нягледзячы на немалады ўзрост, поўны сіл і планаў. Ён пастаянны ўдзельнік выстаў у розных гарадах краіны і за мяжой. Яго творы былі прадстаўлены ў Турцыі, Італіі, Іспаніі, Францыі, Германіі, Польшчы, Літве, Латвіі, Расіі і ЗША... І, безумоўна, у родным Віцебску, іншых гарадах Беларусі перыядычна праходзяць персанальныя выставы яго работ.

**Аляксандр Пукшанскі**

Звязда. — 2012. — 10 сак. — С. 7.